Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
____________________ А.В. Макоўчык
«11» 12 2022 г.
Рэгістрацыйны № УД-27-3-№5/2022/вуч.

# МЕТОДЫКА РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
1-01 02 01 Пачатковая адукацыя

2022 г.

Вучэбная праграма распрацавана на аснове Адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень» АСВА 1-01 02 01-2021, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя», тыпавой вучэбнай праграмы «Методыка развіцця маўлення» (рэгістрацыйны нумар __________), зацверджанай ________

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:

Н.М. Антановіч, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

В.І. Свірыдзенка, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Н.У. Антонава, начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;

Т.Р. Трафімовіч, прафесар кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**УЗГОДНЕНА**

Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі «Пачатковая школа № 103 г. Мінска»

__________________ М.А. Макарэвіч

«28» чэрвеня 2022 г.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай беларускага і рускага мовазнаўства

пратакол № 1 ад «29» жніўня 2022 г.

Загадчык кафедры

__________________ А.С. Васілеўская

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

пратакол № 1 ад «18» 10 2022 г.

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджальных матэрыялаў дзейным патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае.

Метадыст вучэбна-метадычнага аддзела

__________________ Я.В. Ціханава

Дырэктар бібліятэкі

__________________ Н.П. Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця маўлення» для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь распрацавана ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі І ступені па спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя».

Актуальнасць вывучэння дысцыпліны вызначаецца тым, што моўнай адукацыі належыць важнае месца ў гуманітарным развіцці асобы, якое з'яўляецца прыярытэтнай задачай сучаснай школы. Навучанне беларускай мове на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь характарызуецца камунікатыўнай накіраванасцю, якая забяспечвае развіццё ў навучэнцаў гатоўнасці да эфектыўных маўленчых зносін у розных сферах дзейнасці. Менавіта таму падрыхтоўка будучага настаўніка пачатковых класаў прадугледжвае вывучэнне сучасных падыходаў, прынцыпаў, метадаў і прыёмаў развіцця маўлення навучэнцаў, што дазваляе паспяхова фарміраваць у іх маўленча-камунікатыўныя ўменні і навыкі, маральна-этычныя якасці, звязаныя з захаваннем правіл і прынцыпаў зносін.

**Мэта вучэбнай дысцыпліны** – стварыць умовы для авалодання студэнтамі тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі арганізацыі працэсу развіцця маўлення навучэнцаў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі, кіравання працэсам фарміравання культуры маўлення навучэнцаў малодшага школьнага ўзросту.

**Задачы дысцыпліны:**

дапамагчы студэнтам засвоіць навукова-метадычныя веды пра структуру і змест працы па развіцці маўлення навучэнцаў пачатковых класаў;

сфарміраваць у студэнтаў прафесійна-метадычныя ўменні ў арганізацыі працы па развіцці маўлення навучэнцаў І ступені агульнай сярэдняй адукацыі: дапамагчы будучым настаўнікам усвядоміць актуальнасць і мэту развіцця маўлення, кірункі развіцця маўлення; пазнаёміць са зместам працы па развіцці маўлення, закладзеным у вучэбныя праграмы і вучэбныя дапаможнікі па мове і літаратурным чытанні; навучыць планаваць і арганізоўваць працу па развіцці маўлення, правільна выкарыстоўваць нагляднасць і ТСН для развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў;

сфарміраваць прафесійныя ўменні настаўніка, здольнага забяспечыць навучэнцу паўнацэннае маўленчае развіццё;

выхоўваць маральныя і прафесійна значымыя якасці будучых педагогаў; стымуляваць творчыя пошукі студэнтаў, развіваць іх навукова-даследчыя здольнасці; удасканальваць навыкі самастойнай работы з навукова-метадычнай літаратурай.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста адпаведнага профілю, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі**

Вучэбная дысцыпліна «Методыка развіцця маўлення» з’яўляецца дысцыплінай дзяржаўнага кампанента, уваходзіць у модуль «Методыка філалагічнай адукацыі малодшых школьнікаў» і звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Беларуская мова», «Методыка выкладання беларускай мовы», «Руская мова», «Методыка выкладання рускай мовы», «Методыка выкладання літаратурнага чытання», «Методыка навучання грамаце і каліграфія», «Педагагічная рыторыка».

**Патрабаванні да асваення вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам**

Згодна з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі I ступені і тыпавым вучэбным планам па спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця маўлення» накіравана на фарміраванне ў студэнтаў **універсальнай кампетэнцыі** (УК-6): ажыццяўляць прафесійную дзейнасць ва ўмовах абнаўлення яе мэт, зместу, змены тэхналогій, вызначаць метады рашэння прафесійных задач, ацэньваць іх эфектыўнасць і якасць; **базавых прафесійных кампетэнцый** (БПК-1, 5): праектаваць працэс навучання, ставіць адукацыйныя мэты, адбіраць змест вучэбнага матэрыялу, метады і тэхналогіі на аснове сістэмы ведаў у галіне тэорыі і методыкі педагагічнай дзейнасці; ажыццяўляць адбор зместу, форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання, прымяняць іх у адукацыйным працэсе з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

**ведаць:**

навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення;

змест і кірункі працы па развіцці маўлення на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

методыку працы над гукавым ладам маўлення;

методыку слоўнікавай працы;

методыку працы над граматычнай формай слова і сінтаксічнымі сродкамі мовы ў аспекце развіцця маўлення;

методыку працы па развіцці звязнага маўлення;

задачы і змест працы па культуры маўлення на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

**умець**:

планаваць работу па развіцці маўлення на ўроках мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах;

рэалізоўваць задачы фарміравання культуры рускага і беларускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў;

праводзіць аналіз дыдактычнага моўнага матэрыялу і выкарыстоўваць яго пры рэалізацыі розных кірункаў развіцця маўлення навучэнцаў;

прымяняць разнастайныя метады і прыёмы развіцця маўлення навучэнцаў;

выяўляць, класіфікаваць і папярэджваць маўленчыя памылкі рознага характару ў вусных выказваннях і пісьмовых працах навучэнцаў пачатковых класаў;

**валодаць**:

навыкамі падрыхтоўкі і правядзення ўрокаў развіцця маўлення;

метадамі і прыёмамі рэалізацыі розных кірункаў працы па развіцці маўлення на ўроках мовы і літаратурнага чытання;

інфармацыйна-камунікацыйнымі тэхналогіямі, якія забяспечваюць фарміраванне культуры рускага і беларускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў;

навыкамі ацэнкі навучальных работ па развіцці звязнага вуснага і пісьмовага маўлення на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У межах адукацыйнага працэсу па дадзенай вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны, выхаваць любоў і павагу да роднага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі.

**Агульная колькасць гадзін і колькасць аўдыторных гадзін, што адводзяцца на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны ў адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам**

На вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка развіцця маўлення» адведзена ўсяго 90 гадзін, з іх 36 аўдыторныя:

**для дзённай формы атрымання адукацыі:**

у 4 семестры 14 гадзін – лекцыі, з іх 2 гадзіны КСР, 22 гадзіны – практычныя заняткі, з іх 4 гадзіны КСР, 54 гадзіны – самастойная работа; форма кантролю – залік у 4 семестры;

**для завочнай формы атрымання адукацыі:**

у 4 семестры 4 гадзіны – лекцыі, 6 гадзін – практычныя заняткі; форма кантролю – залік у 5 семестры;

**для завочнай скарочанай формы атрымання адукацыі:**

у 4 семестры 2 гадзіны – лекцыі, 4 гадзіны – практычныя заняткі; форма кантролю – залік у 5 семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. НАВУКОВЫЯ АСНОВЫ МЕТОДЫКІ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ

Сутнасць паняццяў «мова», «маўленне», «мысленне». Узаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь мовы, маўлення, мыслення. Віды маўлення: унутранае, знешняе; вуснае, пісьмовае; маналагічнае, дыялагічнае.

Маўленчая дзейнасць як базавае паняцце методыкі развіцця маўлення. Асноўныя палажэнні тэорыі маўленчай дзейнасці. Віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо. Фактары развіцця маўленчай дзейнасці дзіцяці.

Тэорыя тэксту як аснова методыкі развіцця маўлення. Тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці. Асноўныя прыметы тэксту. Авалоданне паняццем «тэкст», фарміраванне тэкставых уменняў у пачатковых класах.

Мэты і задачы развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў. Прынцыпы методыкі развіцця маўлення.

## РАЗДЗЕЛ 2. НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ НАВУЧЭНЦАЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ

### 2.1. Праца над гукавым ладам маўлення

Выпрацоўка навыкаў літаратурнага вымаўлення. Недахопы вуснага рускага і беларускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў, іх прычыны. Умовы паспяховага фарміравання літаратурнага вымаўлення. Кірункі працы на вымаўленчым ўзроўні: адпрацоўка тэхнікі маўлення, засваенне арфаэпічных норм рускай і беларускай моў, удасканаленне інтанацыйных навыкаў навучэнцаў. Тэхніка маўлення і яе кампаненты (маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.). Прыёмы адпрацоўкі маўленчага дыхання і дыкцыі. Дыдактычны матэрыял для адпрацоўкі дыкцыйных навыкаў. Імітацыя як асноўны механізм авалодання арфаэпічнымі нормамі ў малодшым школьным узросце. Папярэджанне і ўстараненне адмоўнага ўздзеяння напісання на вымаўленне. Прыёмы работы па ўдасканаленні інтанацыйных навыкаў навучэнцаў. Маўленчая сітуацыя як важны сродак развіцця інтанацыйных уменняў.

### 2.2. Праца над словам як адзінкай маўлення

Кірункі слоўнікавай працы: узбагачэнне, удасканальванне і актывізацыя слоўнікавага запасу навучэнцаў. Крыніцы ўзбагачэння і напрамкі якаснага ўдасканальвання слоўнікавага запасу.

Змест працы па ўзбагачэнні слоўнікавага запасу навучэнцаў. Прыёмы семантызацыі слоў.

Слоўнікава-семантычная праца на ўроках мовы і літаратурнага чытання: арганізацыя засваення сінонімаў, антонімаў, амонімаў, розных значэнняў мнагазначных слоў; усведамленне рода-відавых адносін паміж словамі.

Слоўнікава-стылістычная праца на ўроках мовы і літаратурнага чытання: практыкаванні ў выкарыстанні новых слоў у словазлучэннях, сказах, тэкстах; аналіз вобразна-выяўленчых сродкаў мовы ў мастацкім тэксце, засваенне навучэнцамі спосабаў вобразнага выражэння ўласных думак.

Гульні і займальныя практыкаванні са словамі на ўроках мовы і літаратурнага чытання. Лагічныя практыкаванні з выкарыстаннем лексічнага матэрыялу.

### 2.3. Праца над граматычнай формай слова і сінтаксічнымі сродкамі мовы ў аспекце развіцця маўлення

Словаформа як адзінка мовы і маўлення. Асаблівасці засваення школьнікамі граматычных форм. Задачы працы над граматычнай формай слова ў аспекце развіцця маўлення: засваенне норм словазмянення і формаўтварэння; узбагачэнне слоўніка навучэнцаў разнастайнымі па сэнсавых і функцыянальна-стылістычных магчымасцях граматычнымі формамі. Змест працы над граматычнай формай слова: абмежаванні ва ўтварэнні і спалучальнасці граматычных форм слова; сэнсавыя і выяўленчыя магчымасці граматычных форм; функцыянаванне граматычных форм у сказе, тэксце.

Словазлучэнне і сказ як аснова развіцця звязнага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў. Тыпалогія маўленчаарыетаваных сінтаксічных практыкаванняў.

### 2.4. Праца па развіцці звязнага маўлення

Задачы і змест працы па развіцці звязнага маўлення. Прапедэўтычныя лінгвістычныя веды, якія павінны набыць вучні пачатковых класаў: паняцце пра тэкст, тэму, структуру і галоўную думку выказвання. Выпрацоўка ўменняў падбіраць да выказвання загалоўкі; вызначаць тып тэксту (апісанне, апавяданне, разважанне), яго структуру; назапашваць фактычны матэрыял для творчых прац розных відаў. Тыпалогія практыкаванняў па развіцці звязнага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў.

Пераказ як від працы па развіцці звязнага маўлення навучэнцаў. Віды пераказаў, агульныя патрабаванні да вусных і пісьмовых пераказаў. Прыёмы працы над падрабязным, сціслым, выбарачным і творчым пераказам. Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы пераказаў, папярэджанне памылак. Методыка правядзення пісьмовага пераказу.

Сачыненне як від працы па развіцці звязнага маўлення вучняў. Віды сачыненняў па крыніцах матэрыялу: па асабістых назіраннях і ўражаннях, па ўласным вопыце, па матэрыялах экскурсій, па прачытаных творах, па сюжэтных малюнках і серыях малюнкаў, па прагледжаных фільмах, спектаклях,

тэлеперадачах. Сачыненні з выкарыстаннем матэрыялаў з розных крыніц. Віды сачыненняў па тыпах тэкстаў: апавяданне, апісанне, разважанне, сачыненні змешанага тыпу. Разнавіднасці сачыненняў (калектыўныя і індывідуальныя) у залежнасці ад ступені ўдзелу настаўніка і класа ў іх падрыхтоўцы. Сачыненні-мініяцюры, іх асаблівасці і месца ў сістэме працы па развіцці звязнага маўлення вучняў.

Методыка работы па падрыхтоўцы і напісанні сачыненняў: збор матэрыялу, яго сістэматызацыя і абагульненне, вызначэнне зместу будучага выказвання, складанне плана. Лексічная, граматычная, арфаграфічная і пунктуацыйная работа пры падрыхтоўцы сачынення, папярэджанне памылак. Структура ўрока напісання сачынення.

## РАЗДЗЕЛ 3. ЗАДАЧЫ І ЗМЕСТ ПРАЦЫ ПА КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

### 3.1. Фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў пачатковых класаў

Сутнасць паняцця «культура маўлення». Кампаненты культуры маўлення (моўны, камунікатыўны, этычны, эстэтычны). Камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, багацце, дарэчнасць, чысціня, лаканічнасць.

Сістэма працы па фарміраванні камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў пачатковых класаў: засваенне норм літаратурнай мовы (рускай, беларускай), папярэджанне і выпраўленне памылак, абумоўленых узроставымі асаблівасцямі маўлення і ўмовамі руска-беларускага білінгвізму; выпрацоўка ўменняў планаваць і ствараць уласныя выказванні сродкамі беларускай і рускай моў; знаёмства з сінаніміяй лексіка-граматычных сродкаў мовы (рускай, беларускай) і асаблівасцямі іх выкарыстання ў маўленчай практыцы; фарміраванне першапачатковых уменняў дарэчнага ўжывання засвоеных лексіка-граматычных сродкаў адпаведна сітуацыі зносін; назапашванне і актывізацыя ў маўленні ўстойлівых форм маўленчага этыкету, знаёмства з тыповымі спосабамі іх спалучэння ў розных сітуацыях зносін; выяўленне і інтэрпрэтацыя вобразных сродкаў мовы; фарміраванне ўменняў выбару найбольш удалых лексіка-граматычных сродкаў мовы (рускай, беларускай) для вобразнага выражэння ўласных думак у канкрэтных сітуацыях зносін.

### 3.2. Класіфікацыя маўленчых памылак і недахопаў, шляхі іх папярэджання і выпраўлення

Сутнасць паняццяў «маўленчая памылка», «маўленчы недахоп», «немаўленчая памылка». Віды маўленчых памылак і недахопаў. Прычыны маўленчых памылак навучэнцаў: няведанне сістэмы мовы, структуры моўных адзінак; няўменне выкарыстоўваць моўныя адзінкі пры стварэнні ўласных выказванняў. Віды немаўленчых памылак: кампазіцыйныя, лагічныя,

фактычныя. Прычыны немаўленчых памылак навучэнцаў: пропуск этапу планавання тэксту, бессістэмна праведзены адбор фактаў і інш.

Праверка пісьмовых творчых прац навучэнцаў пачатковых класаў. Выпраўленне, улік, класіфікацыя, прыёмы ліквідацыі немаўленчых памылак, маўленчых памылак і недахопаў. Арганізацыя працы над памылкамі. Структура ўрока працы над памылкамі. Нормы ацэнкі творчых прац навучэнцаў пачатковых класаў.

# ПАТРАБАВАННІ ДА КУРСАВОЙ РАБОТЫ

У сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў важнае месца займае навукова-даследчая работа студэнтаў, у прыватнасці такая яе форма арганізацыі, як напісанне і абарона курсавой работы (курсавога праекта).

Курсавая работа ўяўляе сабой лагічна завершаны і аформлены ў выглядзе тэксту твор навукова-даследчага зместу, накіраваны на вырашэнне пэўных праблем і задач у галіне методыкі выкладання беларускай мовы.

Выкананне курсавой работы накіравана на дасягненне наступных задач:

- сістэматызацыя, абагульненне, замацаванне і паглыбленне тэарэтычных і практычных ведаў па методыцы выкладання беларускай мовы;
- удасканаленне навыкаў прымянення атрыманых ведаў для рашэння канкрэтных задач, а таксама навыкаў самастойнай работы з навуковай літаратурай і апрацоўкі вынікаў тэарэтычных або эксперыментальных даследаванняў.

Тэма курсавой работы зацвярджаецца на кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі, а заданне на яе выкананне афармляецца кіраўніком.

Курсавая работа па вучэбнай дысцыпліне «Методыка развіцця маўлення» павінна быць пісьменна набрана ў тэкставым рэдактары «Microsoft Word» (версія 6,0; 7,0 і далей) і раздрукавана на аркушах паперы фармата А4 (21,0 см х 29,7 см). Параметры друку: верхняе поле – 2,0 см, ніжняе – 2,0 см, левае – 3,0 см, правае – 1,5 см; шрыфт – Times New Roman; вышыня шрыфта – 14; чырвоны радок – 0,5–1,5 см; міжрадковы інтэрвал – 1; выраўноўванне па шырыні.

Аб'ём курсавой работы павінен знаходзіцца ў межах 25–40 старонак тэксту, уключаючы ілюстрацыі, табліцы і спіс выкарыстанай літаратуры.

Кожную структурную частку – УВОДЗІНЫ, ГЛАВЫ, ЗАКЛЮЧЭННЕ, СПІС ЛІТАРАТУРЫ, ДАДАТАК – трэба пачынаць з новай старонкі.

## Структура курсавой працы

Структура курсавой работы (курсавога праекта) павінна спрыяць раскрыццю выбранай тэмы і яе састаўных элементаў. Усе часткі курсавой работы (курсавога праекта) павінны быць узаемазвязаны і выкладзены ў лагічнай паслядоўнасці. Структура курсавой работы (курсавога праекта) уключае тытульны ліст, змест, уводзіны, асноўную частку, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры, дадаткі.

На **тытульным лісце** пазначаюцца: поўная назва ўстановы адукацыі і назва кафедры, тэма, звесткі пра аўтара (факультэт, курс, прозвішча, імя, імя па бацьку), вучоная ступень і вучонае званне, прозвішча і ініцыялы навуковага кіраўніка; месца і год выканання працы.

**Змест** уяўляе сабой паслядоўны пералік пунктаў і падпунктаў курсавой работы (курсавога праекта). Усе загалоўкі пачынаюцца з вялікай літары, кропкі не ставяцца. Пунктам *Уводзіны, Заключэнне, Спіс выкарыстанай літаратуры* парадкавы нумар не прысвойваецца.

**Уводзіны** ўключаюць абгрунтаванне выбару тэмы, яе актуальнасці, вызначэнне мэты, задач, метадаў і базы даследавання, яго практычнай значнасці (кожная рубрыка пачынаецца з чырвонага радка, назва рубрыкі вылучаецца іншым шрыфтам ці падкрэсліваннем). Ва ўводзінах указваецца аб’ём працы: колькасць старонак, глаў, табліц, схем, малюнкаў, дадаткаў і выкарыстаных крыніц.

Пры абгрунтаванні выбару і *актуальнасці тэмы* даследавання неабходна звярнуць увагу на ступень яе вывучанасці (сцісла асвяціць гісторыю пытання) і сфармуляваць праблему (назваць тое, што трэба вывучыць).

*Мэта даследавання* – тое, што ў агульным выглядзе павінна быць дасягнута падчас працы. Мэта фармулюецца з выкарыстаннем дзеясловаў *абгрунтаваць ролю, раскрыць, паказаць, устанавіць, распрацаваць* і інш. *Задачы* вынікаюць з мэты і канкрэтызуюць яе. Для фармулёўкі задач выкарыстоўваюцца дзеясловы *вывучыць, вызначыць, выявіць, абагульніць, праверыць, апрабаваць* і г.д.

*Метады даследавання* вызначаюцца з улікам спецыфікі задач. Могуць быць выкарыстаны: *метады тэарэтычнага пошуку* – аналіз навуковай і метадычнай літаратуры; вывучэнне метадалагічных асноў методыкі выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах, вывучэнне гісторыі праблемы, аналіз і абагульненне матэрыялаў, атрыманых эмпірычным шляхам; *метады даследавання педагагічнага працэсу* – назіранне за працэсам навучання, вывучэнне пісьмовых прац, тэсціраванне, гутарка, апытанне, анкетаванне, аналіз дакументацыі; *эксперымент* – канстатуючы, навучальны; *метады матэматычнай статыстыкі* – сярэдні паказчык, рэгістрацыя, ранжыраванне і г.д.

*База даследавання*: указваецца вучэбная ўстанова (нумар школы, клас), дзе праводзілася даследаванне.

*Практычная значнасць:* акрэсліваецца, кім і калі могуць быць выкарыстаны матэрыялы, атрыманыя ў ходзе даследавання.

У **асноўнай частцы** вылучаюцца главы, якія пры неабходнасці падзяляюцца на параграфы (іх не трэба афармляць з новай старонкі). Змест структурных частак адпавядае пастаўленым мэце і задачам: разглядаецца гістарычны і тэарэтычны аспекты праблемы даследавання, прыводзіцца крытычны аналіз навуковай і метадычнай літаратуры, асноўныя тэарэтычныя палажэнні пацвярджаюцца адказамі вучняў, вытрымкамі з іх пісьмовых работ, фрагментамі ўрокаў, вынікамі эксперымента, лічбавымі данымі. Пры напісанні глаў і параграфаў даследчык павінен рабіць спасылкі на крыніцы, з якіх ён бярэ матэрыял, а потым аналізуе яго. Спасылкі на літаратуру ў тэксце курсавой

працы (курсавога праекта) афармляюцца ў квадратныя дужкі: [5] – спасылка на запіс у спісе літаратуры, [5, с. 8] – спасылка з указаннем старонак працытаванай працы, [3; 5; 7] – спасылка на шэраг прац.

**Заключэнне** можа быць прадстаўлена ў выглядзе абагульненых вывадаў па кожнай главе, дзе акрэсліваецца значэнне праведзенай працы для паляпшэння якасці навучання, даюцца практычныя рэкамендацыі, раскрываюцца далейшыя перспектывы даследавання тэмы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры** падаецца ў алфавітным парадку і афармляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі «Інструкцыі па афармленні дысертацыі, аўтарэферата і публікацыі па тэме дысертацыі». У спіс уключаюцца ўсе крыніцы, выкарыстаныя ў ходзе даследавання (не менш  за 20–25).

**Дадаткі** ўключаюць схемы, табліцы, дыяграмы, дадатковыя матэрыялы даследавання. Кожны дадатак афармляецца на асобных лістах і мае свой тэматычны загаловак. У правым верхнім вугле ўказваецца парадкавы нумар «Дадатак 1», «Дадатак 2». Нумарацыя старонак працягваецца ў ранейшым парадку.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Методыка развіцця маўлення»
(дзённая форма атрымання адукацыі)

**2 курс, 4 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | КСР | | Самастойная работа | Літаратура | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **1.** | **Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення** | | **2** | **2** | | **8** | [1, 2, 3, 5, 6] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Напрамкі развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў** | **8** | **10** | | **2** | **32** | | |
| 2.1 | Праца над гукавым ладам маўлення | 2 | 2 | | | 8 | [1, 2, 3, 4, 5] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па рускай або беларускай мове і літаратурным чытанні |
| 2.2 | Праца над словам як адзінкай маўлення | 2 | 2 | | 2 | 8 | [1, 2, 3, 5, 7, 10] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па рускай або беларускай мове і |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | літаратурным чытанні |
| 2.3 | Праца над граматычнай формай слова і сінтаксічнымі сродкамі мовы ў аспекце развіцця маўлення | 2 | 2 | | | 8 | [1, 2, 3, 5, 7] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па беларускай і рускай мове |
| 2.4 | Праца па развіцці звязнага маўлення | 2 | | | | | [1, 2, 3, 5, 7, 8] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па развіцці звязнага маўлення |
| 2.4.1 | Сістэма навучання вусным і пісьмовым пераказам | | 2 | | | 4 | [1, 2, 3, 5, 7, 8] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па развіцці звязнага маўлення |
| 2.4.2 | Сістэма навучання вусным і пісьмовым сачыненням | | 2 | | | 4 | [1, 2, 3, 5, 7, 8] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па развіцці звязнага маўлення |
| **3.** | **Задачы і змест працы па культуры маўлення ў пачатковых класах** | **4** | **6** | | **2** | **14** | | |
| 3.1 | Фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | 2 | | | | | [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9] | Франтальнае апытанне |
| 3.2 | Фарміраванне камунікатыўных якасцей беларускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | | 2 | | | 4 | [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9] | Франтальнае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3.2.1 | Фарміраванне камунікатыўных якасцей рускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | | 2 | | | 4 | [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9] | Франтальнае апытанне |
| 3.2.2 | Класіфікацыя маўленчых памылак і недахопаў, шляхі іх папярэджання і выпраўлення | 2 | 2 | | 2 | 6 | [1, 2, 3, 5] | Пісьмовае апытанне |
| | **Усяго за семестр** | **12** | **18** | **2** | **4** | **54** | | **залік** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Методыка развіцця маўлення»
## (завочная форма атрымання адукацыі, 5 гадоў навучання)

**2 курс, 4 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Літаратура | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 9 | 10 |
| **1.** | **Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення** | **2** | | [1, 2, 3, 5, 6] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Напрамкі развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў** | | | | |
| 2.1 | Праца над гукавым ладам маўлення | | 2 | [1, 2, 3, 4, 5] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па рускай або беларускай мове і літаратурным чытанні |
| 2.2 | Праца над словам як адзінкай маўлення | | 2 | [1, 2, 3, 5, 7, 10] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па рускай або беларускай мове і літаратурным чытанні |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 2.4 | Праца па развіцці звязнага маўлення | | 2 | [1, 2, 3, 5, 7, 8] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па развіцці звязнага маўлення |
| **3.** | **Задачы і змест працы па культуры маўлення ў пачатковых класах** | | | | |
| 3.1 | Фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | 2 | | [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9] | Франтальнае апытанне |
| | **Усяго за семестр** | **4** | **6** | | |
| **3 курс 5 семестр** | | | | | |
| | | | | | **залік** |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## «Методыка развіцця маўлення»
## (завочная форма атрымання адукацыі, 3,5 гады навучання)

**2 курс, 4 семестр**

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў | Колькасць аўдыторных гадзін | | Літаратура | Форма кантролю заняткаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 9 | 10 |
| **1.** | **Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення** | | **2** | [1, 2, 3, 5, 6] | Франтальнае апытанне |
| **2.** | **Напрамкі развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў** | | | | |
| 2.4 | Праца па развіцці звязнага маўлення | | 2 | [1, 2, 3, 5, 7, 8] | Праверка распрацаваных канспектаў урокаў па развіцці звязнага маўлення |
| **3.** | **Задачы і змест працы па культуры маўлення ў пачатковых класах** | | | | |
| 3.1 | Фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | 2 | | [1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 9] | Франтальнае апытанне |
| | **Усяго за семестр** | **2** | **4** | | |
| **3 курс 5 семестр** | | | | | |
| | | | | | **залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Методика преподавания русского языка и литературного чтения [Электронный ресурс] : учеб.-метод. комплекс по учеб. дисциплине для специальности 1-01 02 01 «Начальное образование» / сост. Е. С. Василевская // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: https://elib.bspu.by/handle/doc/2203. – Дата доступа: 13.05.2022.
2. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання ў пачатковых класах : вучэб. дапам. / Н. М. Антановіч [і інш.] ; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Выш. шк., 2020. – 264 с.
3. Методыка выкладання беларускай мовы і літаратурнага чытання [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс па вучэб. дысцыпліне для спецыяльнасці 1-01 02 01 «Пачатковая адукацыя» / склад. В. І. Свірыдзенка, Н. М. Антановіч // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/2236. – Дата доступу: 12.05.2022.

**Дадатковая літаратура**

4. Ладыженская, Т. А. Живое слово: устная речь как средство и предмет обучения : учеб. пособие для пед. ин-тов / Т. А. Ладыженская. – М. : Просвещение, 1986. – 124 с.
5. Львов, М. Р. Методика развития речи младших школьников : пособие / М. Р. Львов. – 3-е изд., перераб. и доп. – Тула : Родничок ; М. : Астрель : АСТ, 2003. – 240 с.
6. Львов, М. Р. Основы теории речи : учеб. пособие для студентов пед. вузов / М. Р. Львов. – М. : Академия, 2002. – 248 с.
7. Речь. Речь. Речь : кн. для учителя / под ред. Т. А. Ладыженской. – М. : Педагогика, 1990. – 336 с.
8. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова. Навучальныя пераказы : 2–4 кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Н. У. Антонава, В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Аверсэв, 2015. – 64 с.
9. Свірыдзенка, В. І. Фарміраванне маўленчай культуры білінгвальнай асобы навучэнца пачатковых класаў: тэорыя і практыка : манаграфія / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2019. – 280 с.
10. Свірыдзенка, В. І. Фразеалагізмы на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання : 2–4 кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі / В. І. Свірыдзенка, А. С. Васілеўская. – Мінск : Аверсэв, 2017. – 93 с.

## РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ФОРМЫ І МЕТАДЫ НАВУЧАННЯ

Асноўнымі метадамі навучання, якія спрыяюць уключэнню студэнтаў у пошук і творчую перапрацоўку ведаў, набыццё вопыту самастойнага рашэння разнастайных задач, з'яўляюцца: метады праблемнага навучання (рашэнне праблемных задач, аналіз педагагічных сітуацый, аналіз відэафрагментаў урокаў), інтэрактыўныя метады (распрацоўка план-канспектаў урокаў, правядзенне фрагментаў урокаў, выкананне практыкаарыентаваных заданняў), камунікатыўныя метады (дыскусіі, вучэбныя дэбаты і іншыя інтэрактыўныя формы і метады), праектныя метады (курсавое праектаванне).

Пералічаныя метады патрабуюць шырокага выкарыстання групавых, парных і індывідуальных форм навучання.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў пры прамежкавым і выніковым ацэньванні рэкамендуецца выкарыстоўваць:

– тэсты і тэставыя заданні (у тым ліку ў сістэме Moodle);

– комплексныя кантрольныя работы з рознаўзроўневымі і практыкаарыентаванымі заданнямі.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Самастойная работа з'яўляецца спецыфічным педагагічным сродкам арганізацыі і кіравання самастойнай дзейнасцю студэнтаў у вучэбным працэсе. Самастойная работа студэнтаў фарміруе гатоўнасць да самаадукацыі, павышэння кваліфікацыі, рыхтуе базу для непарыўнай адукацыі.

Пры вывучэнні дысцыпліны рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя формы самастойнай работы студэнтаў:

– падбор і аналіз навукова-метадычнай літаратуры па тэме заняткаў;

– аналіз праграм, падручнікаў і метадычных дапаможнікаў;

– распрацоўку і складанне схем, табліц, сродкаў нагляднасці;

– распрацоўку планаў-канспектаў урокаў, фрагментаў урокаў;

– падбор дыдактычнага матэрыялу па прапанаваных тэмах.

**Патрабаванні да выканання самастойнай работы студэнтаў**

| № п//п | Назва тэмы, раздела | Колькасць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення | 8 | На аснове аналізу метадычнай літаратуры скласці тэзаурус асноўных паняццяў методыкі развіцця маўлення.<br>Прааналізаваць навукова-метадычныя часопісы для пачатковых класаў і знайсці артыкулы, прысвечаныя розным аспектам развіцця маўлення навучэнцаў. Зрабіць бібліяграфічны спіс артыкулаў.<br>Скласці анатацыі 3–4 артыкулаў.<br>Падрыхтаваць вуснае паведамленне, прысвечанае аднаму з аспектаў развіцця маўлення навучэнцаў. | пісьмовая<br><br>пісьмовая<br><br>пісьмовая<br><br>вусная |
| 2. | Праца над гукавым ладам маўлення | 8 | Падабраць скорагаворкі, чыстагаворкі з адметнымі гукамі беларускай мовы, падрыхтаваць практыкаванні на адпрацоўку вымаўлення гукаў.<br>Падабраць практыкаванні на рэгуліраванне маўленчага дыхання і падрыхтавацца да іх правядзення.<br>Скласці спіс слоў на рускай і беларускай мовах, актуальных для маўленчай практыкі навучэнцаў пачатковых класаў, у якіх | пісьмовая<br><br>пісьмовая<br><br>вусная |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | найбольш распаўсюджаны па-мылкі ў пастаноўцы націску. | пісьмовая |
| 3. | Праца над словам як адзінкай маўлення | 8 | Падабраць дыдактычныя гульні для ўрокаў беларускай мовы, накі-раваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу на-вучэнцаў словамі розных лексіка-семантычных груп.<br>Падабраць дыдактычныя гульні для ўрокаў рускай мовы, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу навучэнцаў словамі розных лексіка-семантыч-ных груп.<br>Распрацаваць фрагмент урока правядзення слоўнікавай работы па вучэбным прадмеце “Літаратурнае чытанне” (на прыкладзе любога мастацкага твора з падручніка па літа-ратурным чытанні для 2 класа).<br>Распрацаваць фрагмент урока правядзення слоўнікавай работы па вучэбным прадмеце “Литературное чтение” (на прыкладзе любога мастацкага твора з падручніка па літара-турным чытанні для 3 класа). | пісьмовая<br>пісьмовая<br>пісьмовая<br>пісьмовая |
| 4. | Праца над граматычнай формай слова і сінтаксічнымі сродкамі мовы ў | 8 | Падабраць і распрацаваць розныя віды сінтаксічных практыкаванняў для ўрокаў беларускай і рускай мовы ў II класе. | пісьмовая |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | аспекце развіцця маўлення | | Падабраць і распрацаваць розныя віды сінтаксічных практыкаванняў для ўрокаў беларускай і рускай мовы ў III класе.<br>Падабраць і распрацаваць розныя віды сінтаксічных практыкаванняў для ўрокаў беларускай і рускай мовы ў IV класе. | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 5. | Сістэма навучання вусным і пісьмовым пераказам | 4 | Распрацаваць план-канспект урока напісання пераказу ў IV класе (на бела-рускай мове).<br>Распрацаваць фрагмент урока літаратур-нага чытання для 2 класа па тэме «И. Тургенев. “Воробей”» (этап работы па падрыхтоўцы навучэнцаў да творчага пераказу). | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 6. | Сістэма навучання вусным і пісьмовым сачыненням | 4 | Распрацаваць план-канспект урока напісання сачынення ў IV класе (на беларускай мове).<br>Распрацаваць план-канспект урока напісання сачынення ў IV класе (на рускай мове). | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 7. | Фарміраванне камунікатыўных якасцей беларускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | 4 | Прааналізаваць падручнікі па беларускай мове для 2–4 класаў, знайсці прыклады практыкаванняў (заданняў), накіраваных на фарміраван-не камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў.<br>Прааналізаваць падручнікі па вучэбным прадмеце «Літаратурнае чытанне» для 2–4 класаў, знайсці | пісьмовая |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | прыклады практыкаванняў (заданняў), накіраваных на фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў. | пісьмовая |
| 8. | Фарміраванне камунікатыўных якасцей рускага маўлення навучэнцаў пачатковых класаў | 4 | Прааналізаваць падручнікі па рускай мове для 2–4 класаў, знайсці прыклады практыкаванняў (заданняў), накіраваных на фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў.<br>Прааналізаваць падручнікі па вучэбным прад-меце «Литературное чтение» для 2–4 класаў, знайсці прыклады практыкаванняў (заданняў), накіраваных на фарміраванне камунікатыўных якасцей маўлення навучэнцаў. | пісьмовая<br>пісьмовая |
| 9. | Класіфікацыя маўленчых памылак і недахопаў, шляхі іх папярэджання і выпраўлення | 6 | Скласці схему «Прычыны маўленчых памылак і недахопаў».<br>Скласці схему «Прычыны немаўленчых памылак».<br>Вывучыць нормы ацэнкі творчых прац навучэнцаў пачатковых класаў і зрабіць апорны канспект. | пісьмовая<br>пісьмовая<br>пісьмовая |

## Прыкладны пералік заданняў кіруемай самастойнай работы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне

### Лекцыйныя заняткі

Тэма: **Навуковыя асновы методыкі развіцця маўлення**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі, у якім асвятліць наступныя пытанні:

- віды маўлення: унутранае, знешняе; вуснае, пісьмовае; маналагічнае, дыялагічнае;
- віды маўленчай дзейнасці: гаварэнне, слуханне, чытанне, пісьмо;
- тэкст як прадукт маўленчай дзейнасці; фарміраванне тэкставых уменняў у пачатковых класах;
- мэты і задачы развіцця маўлення навучэнцаў пачатковых класаў;
- прынцыпы методыкі развіцця маўлення.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі па адзначаных вышэй пытаннях.

Прааналізаваць вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Рускій язык» (2–4 класы); адзначыць, як у гэтых праграмах прадстаўлены змест працы па развіцці маўлення навучэнцаў.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры падрыхтаваць канспект лекцыі па адзначаных вышэй пытаннях.

Прааналізаваць вучэбныя праграмы па вучэбных прадметах «Беларуская мова», «Рускій язык», «Літаратурнае чытанне», «Литературное чтение» (2–4 класы); адзначыць спецыфіку прадстаўлення зместу працы па развіцці маўлення навучэнцаў у праграмах па мове і літаратурным чытанні.

### Практычныя заняткі

Тэма: **Праца над словам як адзінкай маўлення**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры вылучыць і заканспектаваць прыёмы працы над сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі, вобразна-выяўленымі сродкамі мовы на ўроках мовы і літаратурнага чытання; скласці апорны канспект асноўных паняццяў па тэме.

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры вылучыць і заканспектаваць прыёмы працы над сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі, вобразна-

выяўленымі сродкамі мовы на ўроках мовы і літаратурнага чытання; скласці апорны канспект асноўных паняццяў па тэме.

Прааналізаваць падручнікі па мове ці літаратурным чытанні; прывесці прыклады практыкаванняў і заданняў з сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі, вобразна-выяўленымі сродкамі мовы.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры вылучыць і законспектаваць прыёмы працы над сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі, вобразна-выяўленымі сродкамі мовы на ўроках мовы і літаратурнага чытання; скласці апорны канспект асноўных паняццяў па тэме.

Прааналізаваць падручнікі па мове ці літаратурным чытанні; прывесці прыклады практыкаванняў і заданняў з сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі, вобразна-выяўленымі сродкамі мовы.

Самастойна распрацаваць заданні з сінонімамі, антонімамі, мнагазначнымі словамі.

Тэма: **Класіфікацыя маўленчых памылак і недахопаў, шляхі іх папярэджання і выпраўлення**

***Узровень 1 (азнаямленне, разуменне)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры скласці адну са схем на выбар:

- «Тыпы маўленчых памылак і недахопаў у беларускім маўленні навучэнцаў пачатковых класаў».
- «Тыпы маўленчых памылак і недахопаў у рускім маўленні навучэнцаў пачатковых класаў».

***Узровень 2 (прымяненне, аналіз)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры скласці дзве названыя вышэй схемы. Адзначыць сярод вылучаных тыпаў памытак тыя, якія ўзнікаюць у вучняў пад уплывам інтэрферэнцыі.

***Узровень 3 (сінтэз, ацэнка)***

На аснове вывучэння метадычнай літаратуры скласці адну з названых вышэй схем. Праверыць некалькі (не менш за 5–7) творчых прац навучэцаў 2, 3 або 4 класаў на выбар (прыклады прац прапануюцца выкладчыкам або рыхтуюцца студэнтам самастойна па дамоўленаці з настаўнікам пачатковых класаў; можна выбіраць пераказы або сачыненні на рускай або беларускай мовах). Зрабіць аналіз маўленчых памылак і недахопаў у працах. Распрацаваць план-канспект урока працы над памылкамі, дапушчанымі ў пераказе або сачыненні.

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Беларуская мова» | Беларускага і рускага мовазнаўства | Змест праграмы ўзгоднены на стадыі распрацоўкі | Пратакол № 1 ад 29.08.2022 г. |
| «Методыка выкладання беларускай мовы» | | | |
| «Руская мова» | | | |
| «Методыка выкладання рускай мовы» | | | |
| «Методыка выкладання літаратурнага чытання» | | | |
| «Методыка навучання грамаце і каліграфія» | | | |
| «Педагагічная рыторыка» | | | |